# Легенда
# ў аздараўленчым лагеры «Праменьчык»
# «Вясёлы экспрэс»

"Вясёлы экспрэс" – гэта свет радасці, свет адкрыццяў, свет чароўнага побач.

Жыхарамі "Вясёлага экспрэса" сталі жыццярадасныя і дзіўныя Гномы. Вакол столькі займальнага і цікавага, што Гномы не могуць аставацца дома: неабходна ўсё паспець, убачыць, усяму паспець здзівіцца. Тым больш што Галоўная Фея абяцала самым дапытлівым і актыўным Гномам падарыць каштоўны падарунак.

І Гномы адпраўляюцца на Вясёлым экспрэсе ў падарожжа гульняў, ведаў і забаў. Якія іх чакаюць прыгоды, ніхто не ведае, але тым цікавей падарожжа.

На шляху Гномы робяць прыпынкі на розных станцыях, дзе ўдзельнічаюць у розных забавах, спартыўных мерапрыемствах, экскурсіях, творчых конкурсах. Гномаў, якія вызначыліся, ад імя Галоўнай Феі праваднікі экспрэса ўзнагароджваюць спецыяльным знакам – Матыльком, які памяшчаецца ў Кнігу Вандроўніка. Перамагае той атрад, які атрымае большую колькасць Матылькоў.